Important Bird Area: Liasnaja river

© В. Прокопчук

Code: BY049

Central coordinates: 52° 10' N 23° 41' E

Location: Brestskaya voblast: Brest region, Kamyanets region

Area: 9239 ha

IBA Criteria: A1, A4i, B1i

National conservation status: паўднёвая частка (6 654,46) га) ў складзе біялагічнага заказніка мясцовага значэння «Бугскі», паўночная частка ў складзе НП «Белавежская пушча»

International conservation status: ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў 2010 г.

Site description:

Тэрыторыя ТВП цалкам ахоплівае поймы і даліны р. Лясная і часткова рэк Лясная Правая і Лясная Левая. Усе яны адносяца да басейна р. Заходні Буг. Даліны рэк адносяцца да рэгіёну раўнін і нізін Перадпалесся і знаходзяцца ў геамарфалагічным раёне Высокаўскай-водна-ледніковай марэннай раўніны. Пасля зліцця Левай і Правай Лясных каля в. Вугляны, рака Лясная ў паўднёва-заходнім кірунку працякае па ўзгорыстай тэрыторыі ў сярэднім і верхнім цячэнні. У ніжнім цячэнні, агібае раўніну з поўдня і пападае на тэрыторыю Брэсцкага Палесся,

утвараючы натуральную мяжу паміж двума буйнымі ландшафтнымі структурамі. Шырыня рачной даліны 2-4 км, поймы ад некалькіх метраў да 200-600 м у сярэднім цячэнні і 1 км у верхнім і ніжнім цячэнні. У вільготны перыяд пойма заліваецца на глыбіню 0,3-0,8 м на перыяд да 3 тыдняў.

Паверхня даліны роўная, перарэзаная каналамі, прытокамі, рукавамі, старарэччамі, складаецца з тарфянікаў і пяскоў, занята пераважна лугамі, зарослымі ў рознай ступені хмызняком.

Рэчышча ракі крутое, у некаторых месцах вельмі крутое, са свабоднымі меандрамі. Там, дзе рака разгаліноўваецца на некалькі рукавоў, цяжка вызначыць галоўнае рэчышча. Паміж рукавамі вельмі часта сустракаюцца забалочаныя астравы. Шырыня ракі ў межань 10-30 м. Берагі вышынёй 1-1,5 м, месцамі 3-4 м.

Сярод самых важных прытокаў на тэрыторыі ТВП патрэбна назваць малыя рэкі: Крывуля, Точыя, Кавалёўка, Лютая, Градаўка.

У цэлым, на тэрыторыі ТВП захавалася выразная занальная расліннасць, сфарміраваная ў залежнасці ад мясцовых умоў размяшчэння. Такім чынам, у самім рэчышчы назіраюцца асацыяцыі воднай расліннасці (*Nymphaeion, Patamagenion*), далей асацыяцыя *Bidentaliatripatrii*, прыбярэжныя зараснікі трыснягу і асакі. Далей выступаюць тыповыя зараснікі вярбы і вольхі, пасля чаго ў залежнасці ад глебы выступаюць розныя тыпы лясоў і бароў. Лясная расліннасць прадстаўлена больш за 20 асацыяцыямі. Лясістасць тэрыторыі невялікая і прадстаўлена разарванымі невялікімі ўчасткамі: альбо хваёвымі пасадкамі на ўзвышшах, альбо фрагментамі поймавых, у асноўным, лісцёвых лясоў.

На рацэ размешчаны г. Камянец і шэраг дробных населеных пунктаў. Упадае ў р. Заходні Буг у некалькіх кіламетрах на поўнач ад г. Брэста.

Асноўны спосаб гаспадарчага выкарыстання тэрыторыі – сельскагаспадарчая дзейнасць і рыбалоўства.

Habitats:

Згодна з падзелам ландшафтаў на раёны водазборны басейн Лясной адносіцца да падзоны Палескіх (шыракалістных лясных ландшафтаў) Палескай правінцыі алювіяльных тэрасавых балотных, а таксама водна-ледавіковых ландшафтаў). Асноўныя біятопы прадстаўлены комплексамі водна-балотных экасістэм (рэкі, поймавыя азёры і старыцы, балоты, каналы) – каля 20%; адкрытыя прасторы (лугі,

сельгасугоддзі, рудэральныя і невыкарыстоўваемыя землі) – каля 50%. Значную плошчу займае комплекс хмызнякова-рэдкалесных экасістэм – каля 30%. Ад месца зліцця рэк Лясная Правая і Лясная Левая да г. Камянца даволі значную плошчу займаюць трысняговыя зараснікі, размешчаныя ўздоўж рэчышча і шматлікіх пратокаў і стырыц.

Birds:

Арнітафаўна налічвае больш за 180 відаў птушак, большая частка з якіх гняздзіцца.

Зыходзячы з вынікаў назіранняў, найбольш важнымі для вясновых мігрантаў з'яўляюцца ўчастакі поймы р. Лясная ў раёне вёсак Чарнакі, Шышова, Вугляны, Радасць, Кругель, Покры. Рака Лясная - на тэрыторыі паўднёвага захаду Беларусі (басейн р. Заходні Буг), гэта найбуйнейшае месца канцэнтрацыі вясновых мігрантаў.Максімальная агульная колькасць водна-балотных мігрантаў адзначаных тут адначасова можа дасягаць больш за 15 тыс. асобін. Найбольш шматлікія мігрыруючыя віды белалобая гусь *Anser albifrons*, гусь-гуменніца *Anser fabalis*, шэрая гусь *Anser anser*, качка-свіцьва *Anas penelope*, крыжанка, качка-шылахвостка, кнігаўка. Увогуле за перыяд вясновай міграцыі праз дадзеную тэрыторыю мігрыруе больш за 50 000 водна-балотных птушак. Буйныя зграі затрымоўваюцца тут на тэрміны ад некалькіх дзён да тыдня і больш, у залежнасці ад пагодных умоў і характару павадка. Таксама на ТВП Лясная рэгулярна адзначаюцца вялікія зграі залацістай сеўкі *Pluvialis apricaria*, у асноўным восенню, якія налічваюць тысячы асобін.

На паплавах адзначаны калоніі розных відаў кулікоў, у тым ліку вялікага грыцука *Limosa limosa* і дубальта *Gallinago media*.

Other animal groups:

Жывёльны свет ТВП вельмі багаты, налічвае тысячы відаў, у асноўным безхрыбетных, больш за 50 відаў млекакормячых; трэба адзначыць і тую акалічнасць, што ў межах ТВП ён недастаткова вывучаны. З каляводных звяроў шматлікім з'яўляецца бабёр, выдра, андатра, лясны тхор, амерыканская норка. З буйных капытных жывёл сустракаюцца лось, алень, дзік, касуля. З драпежнікаў – воўк, лісіца, янотападобны сабака.

З занесеных у Чырвоную кнігу млекакормячых тут жывуць барсук *Meles meles* і

арэшнікавая соня *Muscardinus avellanarius*, адзначаны перыядычныя заходы рысі *Lynx lynx*.

Герпетафауна ўключае 8 відаў земнаводных і 5 відаў паўзуноў. З ахоўваемых у Еўропе рэптылій адзначана балотная чарапаха *Emys orbicularis*.

На тэрыторыі ТВП (рэкі и торфапляцоўкі) адзначана каля 30-ці відаў рыб.

Populations of IBA trigger species:

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Bean goose *Anser fabalis*	P	3000-10000 individuals	2004-2011	Medium	↓	A4i
White-fronted goose *Anser albifrons*	P	10000-15000 individuals	2004-2011	Medium	↓	A4i
Greylag goose *Anser anser*	B	1-3 breeding pairs	2004-2011	Medium	↑	
Greylag goose *Anser anser*	P	10-100 individuals	2004-2011	Medium	↑	
Wigeon *Anas penelope*	P	10000-20000 individuals	2004-2011	Medium	↔	A4i
Mallard *Anas platyrhynchos*	P	3000-5000 individuals	2004-2011	Medium	↔	
Pintail *Anas acuta*	P	500-1000 individuals	2004-2011	Medium		B1i
Goosander *Mergus merganser*	P	500-1000 individuals	2004-2011	Poor		
Bittern *Botaurus stellaris*	B	10-15 breeding pairs	2004-2011	Poor	↔	
Little bittern *Ixobrychus minutus*	B	+	2004-2011	Poor		

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Great white egret *Casmerodius albus*	P	30-60 individuals	2004-2011	Medium	↑	
Red kite *Milvus milvus*	N	+	2004-2011	Poor		
White-tailed eagle *Haliaeetus albicilla*	P	+	2004-2011	Poor	↔	
Osprey *Pandion haliaetus*	P	+	2004-2011	Poor		
Corncrake *Crex crex*	B	60-120 males only	2004-2011	Medium		
Crane *Grus grus*	B	4-8 breeding pairs	2004-2011	Medium	↑	
Crane *Grus grus*	P	500-1500 individuals	2004-2011	Medium	↔	
Ringed plover *Charadrius hiaticula*	B	+	2004-2011	Poor		
Golden plover *Pluvialis apricaria*	P	10000-20000 individuals	2004-2011	Medium		A4i
Ruff *Philomachus pugnax*	P	500-1000 individuals	2004-2011	Medium		
Great snipe *Gallinago media*	B	+	2004-2011	Medium		
Black-tailed godwit *Limosa limosa*	B	50-100 breeding pairs	2004-2011	Medium	↓	A1
Common gull *Larus canus*	P	+	2004-2011	Poor		
Little tern *Sternula albifrons*	B	+	2004-2011	Poor		

Species	Season	Quality of estimate	Period	Quality of estimate	Trends	IBA criteria
Whiskered tern *Chlidonias hybrida*	B	+	2004-2011	Poor		
Black tern *Chlidonias niger*	P	+	2004-2011	Poor		
Eagle owl *Bubo bubo*	B	1-3 breeding pairs	2004-2011	Good	↓	
Short-eared owl *Asio flammeus*	B	+	2004-2011	Poor		
Kingfisher *Alcedo atthis*	B	20-35 breeding pairs	2004-2011	Medium	↔	
Tawny pipit *Anthus campestris*	B	+	2004-2011	Poor		

Other biodiversity:

Расліны: званок лілеялісты*Adenophoralilifolia,* лілея кучаравая*Liliummartagon*, касач сібірскі *Irissibirica*, гарлачык белы *Nymphaeaalba*, шалфей лугавы *Salvia pratensis*

Threats:

- асушальная меліярацыя;
- нестабільнасць узроўню вады (летнія паводкі пасляінтэнсіўных зацяжных дажджоў);
- узворванне поймавых земляў (у тым ліку ў прыбярэжнай паласе і вадааховай зоне);
- забудова ў прыбярэжнай паласе;
- выпальванне травяністай расліннасці;
- будаўніцтва транспартна-інжынерных камунікацый;
- зарастаннепоймы і адчыненых біятопаў шматгадовай пустазельнай і хмызняковай расліннасцю;
- прамое ўздзеянне хімічных угнаенняў і пестыцыдаў;
- веснавое паляванне и браканьерства.

Recommendations for the conservation:

Забараніць узворванне поймавых лугоў, кашэнне пад час гнездавання птушак, меліярацыю і будаўніцтва ў прыбярэжнай паласе.

На дадзенай тэрыторыі мэтазгодна ў перыяд вясновай міграцыі ўводзіць абмежаванні на любую дзейнасць, асабліва паляванне. Таксама неабходна забараніць любыя працы па трансфармацыі гэтай тэрыторыі, неабходны штогадовы маніторынг стану папуляцый птушак і пагроз. Магчыма неабходна і наданне ахоўнага статуса разглядаемай тэрыторыі.

Неабходна кашэнне ў месцах канцэнтрацыі мігрантаў (штогод, або раз на два гады) у жніўні.

References:

Абрамчук А.В. Миграция водно-болотных птиц в Беловежской пуще // Беловежская пуща. Исследования. – Брест, Академия, 2006. – Вып.12. – С.164-182.

Ацэнка якасці вады ракі Лясная Правая ў 1997-2000 гадах// Бібліятэка маніторынгу навакольнага асяроддзя. – Беласток, 2002. С. 82

Веремчук О.Н., Жуковский А.Т., Шималов В.В., Третьяков Д.И., Шокало Б.И., Фенчук В.А., Чеботарева Н.А., Марзан И.Г. К изучению биоразнообразия заказника «Бугский» // Антропогенная динамика ландшафтов, проблемы сохранения и устойчивого использования биологического разнообразия: Материалы II республ.

науч.-практич. конф. (1-2 дек. 2004 г., Минск). Минск, 2004. С. 113-114.

ВеремчукО.Н., ШималовВ.В., ЖуковскийА.Т., ТретьяковД.И., ФенчукВ.А., ШокалоБ.И., ЧеботареваН.А., БогдановичИ.А. Биоразнообразиеландшафтногозаказника «Бугский» // ПрыроднаеасяроддзеПалесся: асаблівасці і перспектывыразвіцця: Тэз. дакл. III Міжнар. навук. канф. (7-9 чэрвеня 2006 г., Брэст). Брест, 2006. С. 97.

Изучение биоразнообразия природных комплексов ландшафтного заказника «Бугский»: отчет о НИР (заключ.) / БрГУ имени А.С. Пушкина; рук. О.Н. Веремчук; исполн.: О.Н. Веремчук [и др.]. – Брест, 2006. – 58 с. – Библиогр.: с. 28. – № ГР 20062686.

Authors : Абрамчук А.В., Багдановіч І., Пракапчук В.В, Сербун А.А., Фянчук В.А.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*